Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На працы справы ідуць добра, ёсць магчымасць заключэння ўдалых кантактаў з замежнымі партнёрамі. Аднак ваш настрой радасным не назавеш. Калі спатрэбіцца эмацыянальная падтрымка, можаце разлічваць на сяброў. А вось ад непатрэбных сустрэч са стороннімі людзьмі лепш адмовіцца, яны могуць неспрыяльна адбіцца на вашай энергетыцы.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень абяцае пачацца з добрых навін, якія адкрыюць перад вамі новыя гарызонты ў асабістым жыцці. Панядзелак акажацца прыемным і гарманічным днём. У сераду на працы і дома магчымыя канфліктныя сітуацыі, таму будзьце асабліва асцярожныя ў словах і ўчынках. Кантралюйце кожны крок, інакш усплёск эмоцый з наступнымі разборкамі практычна немінучы.

БЛІЗНЯТЫ. Вы будзеце шмат працаваць, займацца творчымі праектамі, якія абяцаюць прыбытак і поспех. Кола знаёмстваў пашырыцца. Будзеце размаўляць на цікавыя тэмы, атрымаеце незвычайную прапанову. Выхадныя дні зоркі раяць правесці на людзях.

РАК. Ваш азартны настрой у пачатку тыдня можа змяніцца на дзелавы ў яго сярэдзіне. У сераду і чацвер лепш з годнасцю саступіць начальству, чым спрачацца і ўпарціцца. Выхадныя дні акажуцца ўдалымі, калі вы не забудзецеся пра інтарэсы блізкіх людзей.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні дзейнічайце не спяшаючыся, настойліва прасоўваючыся да пастаўленай мэты. У панядзелак не варта асабліва перажываць за іншых і ўзвальваць на плечы чужы клопат. У кожнага свае праблемы і спосабы іх вырашэння. Інакш вы будзеце папраўляць свечкі ў чужой царкве. У сераду і чацвер варта нагадаць начальству пра свае таленты і дасягненні. У пятніцу магчыма прапанова аб пераходзе на новую працу, але ваша рашэнне павінна быць прадуманым. Пасля дастаткова напружанага тыдня варта добра адпачыць у законныя выхадныя дні.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні не варта расслабляцца на працы, інакш вас абвінавацяць у ляноце, магчымы канфліктныя сітуацыі. Неабходна засяродзіцца на самым галоўным, пакінуўшы ў спакоі не такія значныя дробязі. Спатрэбяцца сілы і энергія для рэалізацыі вашых ідэй і планаў. У сераду будзе неабходна задзейнічаць такія якасці, як актыўнасць і рашучасць. У чацвер можа здарыцца небывалы ўздым працаздольнасці, многае паспееце. Не прапусціце гэты залаты час. У выхадныя не сядзіце дома, выбірайцеся ў госці да сяброў.

ШАЛІ. Тыдзень добры для тых, хто аддае перавагу актыўнаму ладу жыцця. Ён схіляе да творчасці, але патрабуе вялікай рухавасці. Ідэі могуць сыпацца з вас, нібы з рога дастатку. Высокая магчымасць атрымання пазітыўных навін у прафесійнай сферы. Паспрабуйце стрымліваць раздражняльнасць, інакш у эмацыянальным парыве можаце наламаць дроў на пару ацяпляльных сезонаў наперад. Серада — выдатны дзень для набыцця новых ведаў, пастаўцеся да гэтага працэсу сур'ёзна. У суботу адарвіцеся ад усіх спраў і клопатаў і проста памарце пра будучыню, магчыма, у гэты момант вас наведае выдатная ідэя.

СКАРПІЁН. Груз праблем, які застаўся з мінулага тыдня, вы здолееце скінуць і будзеце гатовы да вырашэння новых задач, а творчы настрой дазволіць здзіўляць сяброў і калег свежымі ідэямі. Можаце разлічваць на пахвалу ад начальства. У сераду не спяшайцеся дзяліцца сваімі геніяльнымі думкамі, пакіньце іх пакуль у таямніцы. Выхадныя падораць прыемныя ўражанні.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень можа аказацца вельмі паспяховым. Атрымаеце прапанову аб нядрэннай падпрацоўцы. І можаце вырашыць усе свае матэрыяльныя праблемы. У панядзелак сёе-тое можа застаць вас знянацку, затое аўторак і серада прынясуць жаданую ўдачу. Пабольш упэўненасці ў сабе і дыпламатычнасці. Да выхадных у сям'і адновіцца атмасфера даверу і ўзаемаразумення.

КАЗЯРОГ. Гэты тыдзень будзе напоўнены падзеямі: знаёмства з новымі людзьмі, сустрэчы і паездкі. Шмат будзе цікавай і разнастайнай працы. Аднак паспрабуйце не стаміцца і не пераацаніць свае сілы. У панядзелак вам, магчыма, давядзецца звярнуцца па дапамогу да сяброў. У сераду працаздольнасць будзе на небывалым узроўні, зможаце зрынуць горы. Пятніца спрыяльная для паездак, камандзіровак і пачатку падарожжаў.

ВАДАЛІЎ. Для вас цяпер адно з самых хвалюючых пытанняў — гэта пытанне кар'еры. Вам неабходна вызначыцца, што вы хочаце ад жыцця. Самы час змяніць сістэму каштоўнасцяў, пазбавіцца ад ілюзій. Паспрабуйце дапамагаць навакольным, але не ўзвальваць усе праблемы на сябе. Пакажыце сваю прывабнасць у сяброўскай кампаніі. Наведайце цікавую выстаўку, гэта ўзбагаціць вас.

РЫБЫ. Добры час для вырашэння асабістых і службовых праблем. Вялікі шанц знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй. Будзеце пастаянна адчуваць падтрымку навакольных амаль ва ўсіх сваіх пачынаннях. Магчымы пазітыўныя перамены на працы. Чацвер будзе насычаны зносінамі з рознымі людзьмі, што можа вас стаміць. Паспрабуйце ўсё ж быць ветлівым, цікавым і абаяльным суразмоўнікам. Добра было б у выхадныя аднавіць патрачаныя сілы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.15	20.03	13.48
Віцебск —	6.03	19.55	13.52
Магілёў —	6.06	19.53	13.47
Гомель —	6.05	19.47	13.42
Гродна —	6.31	20.17	13.46
Брэст —	6.35	20.15	13.40

Месяц

Поўня 26 жніўня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Георгія, Дзяніса, Емяльяна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Рыгора, Яўгена.*
К. *Ізабелы, Паўліны, Багдана, Марка, Раймунда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

31 ЖНІЎНЯ

1883 год — у Мінску пабудавана тытунёвая фабрыка купчыхі Р. М. Цукерман-Давідзон. Выпускала махорку, бакун (найніжэйшы гатунак тытуню), нюхальны тытунь. У 1895 годзе на фабрыцы працавалі 28 рабочых, дзейнічаў газавы рухавік магутнасцю шэсць конскіх сіл, выпушчана прадукцыі на 35 тысяч рублёў. У 1913 годзе працавалі 40 рабочых, была дынама-машына і газавы рухавік, выпушчана прадукцыі на 165,5 тысячы рублёў. Знаходзілася ў раёне Нямігі.

1908 год (дакладная дата невядомая) — у Віцебску нарадзіўся Аляксандр Арлоў, скульптар. Удзельнічаў у скульптурным афармленні Дома ўрада, Цэнтральнага Дома афіцэраў, Палаца піянераў у Мінску, беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Загінуў у 1942 годзе ў фашысцкім канцлагеры.

1908 год — нарадзіўся Леанід Сямёнавіч Персіянінаў (Смаленская вобласць, Расія), беларускі і расійскі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, акадэмік АМН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар навуковых работ па вывучэнні родавой дзейнасці, барацьбе з траўматызмам жанчын падчас родаў, абязбольванні ў акушэрска-гінекалагічнай практыцы, прафілактыцы смяротнасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1978 годзе.

1948 год — нарадзіўся Васіль Аляксандравіч Шырко (вёска Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці), беларускі пісьменнік. Аўтар кніг «Зямлі бацькоўскай прыцягненне», «Сцяжына да людзей», «Дарагія мае землякі», «Дзед Манюкін і ўнукі». Напісаў кінасцэнарый «Песня пшанічнага поля». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1963 год — нарадзіўся Вячаслаў Іванавіч Чарнуха (вёска Святая Воля Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці), беларускі дырыжор. Пад яго музычным кіраўніцтвам у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі ажыццёўлены прэм'еры опер «Турандот» Дж. Пучыні, «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага, «Юбілей» С. Картэса і інш.

1787 год — нарадзіўся Міхаіл Фанвізін, мысліцель, дзекабрыст, прадстаўнік рускага ўтапічнага сацыялізму.

1900 год — пачаліся продажы «Кока-Колы» ў Брытаніі.

1909 год — арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць 16-гадовы Уладзімір Маякоўскі пераведзены ў Бутырскую турму, дзе ён і пачаў пісаць вершы.

1998 год — на тэрыторыі Латвіі спыніў работу апошні ваенны аб'ект Расіі — Цэнтр назірання за касмічнымі аб'ектамі ў Скрундэ, а калі прасцей, радыёлакацыйная станцыя супрацьракетнай абароны. Працаваў з 1969 года.

УСМІХНЕМСЯ

Скандал у сям'і вегетарыянцаў.

— Ты што такое мне прыгатавала?!

— Гэта вельмі карысная салата з прарасткамі кіноа...

— Я тут працую цэлы дзень, каб есці нейкую чортаву салату? Я мужык, мне патрэбныя соевыя катлеты!

Ніколі я не бачыў столькі прыгожых жанчын, як на другім годзе службы ў войску.

Дзякуючы сваёй дзяўчыне я забыўся, што такое гатаванне. Яна лепш за ўсіх заказвае ежу.

Пры рамонце ў кабінеце дэкана мехмата сталяр Пятроў упусціў на нагу малаток і тым самым сказаў сваё слова ў навуцы.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2998.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12